Аддзел адукацыі, спорту і турызму
Салігорскага раённага выканаўчага камітэта

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
“Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”

**Раённы тур абласнога этапу рэспубліканскага завочнага конкурсу на лепшую сцэнарную распрацоўку конкурсна-гульнёвай праграмы**

# А ў нас сёння Каляда

**гульнёва-забаўляльная праграма**
**для старэйшага школьнага ўзросту**

Аўтар
Таратута Ніна Мікалаеўна,
педагог дадатковай адукацыі
дзяржаўнай установы
дадатковай адукацыі “Цэнтр
творчасці дзяцей і моладзі
Салігорскага раёна”
223710,
Мінская вобласць,
г. Салігорск,
вул. Леніна, д. 57
тэл. 8 (0174) 277-121

Салігорск 2017

# Анатацыя

У сваёй распрацоўцы я змяшчаю сцэнар, які адлюстроўвае самабытнасць правядзення  Калядак беларусаў праз увасабленне яго ў тэатралізавана-гульнёвым варыянце. Даюцца метадычныя парады па арганізацыі святкавання, рэкамендуецца адпаведная літаратура.

Сцэнар ілюстраваны фотаздымкамі, якія зроблены непасрэдна ў час правядзення гульнёва-забаўляльнай праграмы.

Прапануецца настаўнікам, педагогам дадатковай адукацыі, педагогам-арганізатарам, работнікам устаноў культуры, усім прыхільнікам традыцыйнай спадчыны беларускага народа.

Спадзяюся, што ў трэцім тысячагоддзі дадзены сцэнар не страціць сваёй надзённасці і актуальнасці і пры ўвасабленні будзе прыхільна сустрэты гледачамі. Буду глыбока ўдзячна, калі прапанаваны сцэнар знойдзе сваіх пастаноўшчыкаў!

Запрашаю чытачоў далучыцца да гульнёва-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда”, адчуць хараство народнага абраду, жартаўлівую іскрыстасць святочнага дзеяння.



## Уводзіны

Засвяткуе школа –
Засвяткуе ўвесь народ

Вельмі цудоўна, што зараз мы, беларусы, вяртаемся да згубленых вытокаў і са спадчынай продкаў крочым у будучыню.

Але, на жаль, для многіх юнакоў і дзяўчат, шкала каштоўнасцей зведзена да дзвюх вызначальных велічынь: культа сілы і грошай. Той ідэалізаваны рай, па сутнасці, гэта бездухоўнае пекла, якое прапануецца сучасным кіно і тэлебачаннем, і ў якім пануе супергерой, непазбежна пераносіцца ў рэальныя каардынаты існавання чалавека. У выніку самая вялікая каштоўнасць зямной цывілізацыі – жыццё – сёння становіцца ў адзін шэраг са звычайнымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі, якія можна купіць, прадаць або ўвогуле знішчыць. Безумоўна, фарміраванне сучаснага чалавека як асобы адбываецца ў свеце інавацыйных камп'ютарных тэхналогій і сродкаў масавай інфармацыі, і ён проста не можа хоць у пэўнай ступені не ведаць культуру, філасофію, эканоміку нашых суседзяў або народаў іншых кантынентаў. Юнакі і дзяўчаты пакідаюць свае сем'і або адмаўляюцца ад іх стварэння, утвараюць свае лакальныя зоны існавання і жывуць па прынцыпах сваёй субкультуры, падчас, нават антысацыяльнай накіраванасці.

Перакананая, калі нешта нязвыклае, экзатычнае вабіць сваёй прыцягальнай адметнасцю, то сапраўдную апору для душы можа даць толькі духоўны вопыт шматвяковых высілкаў свайго народа.

І вось шчаслівы лёс выпаў на долю сучасных педагогаў, выхавацеляў, кіраўнікоў дзіцячых фальклорных калектываў. Нам, педагогам, дзякуючы працэсу нацыянальна-культурнага адраджэння нашай нацыі, неабходна зрабіць захаваную святочную культуру продкаў асновай патрыятычнага, эстэтычнага, маральнага выхавання дзяцей устаноў адукацыі.

А ў нас, у беларусаў, вельмі багатая гісторыя і традыцыйная культура. Дык няхай жа гучаць на святах старадаўнія песні, гаспадыні дастаюць з куфраў прыгожыя посцілкі, кашулі, касцюмы, маладыя пары едуць да царквы вянчацца. Дзеці гуляюць у беларускія народныя гульні, танчаць нашыя побытавыя танцы.

У доме, дзе не гуляюць, не жартуюць, не спяваюць песень, мір дзіцяці эмацыянальна і духоўна збеднены. Педагогі дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” добра разумеюць гэта, таму імкнуцца далучаць сваіх навучэнцаў да работы па даследаванні мясцовага фальклору, збіранні звестак аб народных абрадах і традыцыях.

Трэба ведаць - сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося,
Як сахой даўней аралі,
Як смычком зямлю бярлялі,
Як з сявенькі збожжа зерні

Рассявалі чорнай жменяй...
Трэба ведаць... Што зазналі...
Трэба ведаць... І пра тое,
Апраналі што? І якое?
Трэба ведаць.

Пятрусь Броўка




**Шчыра запрашаем Вас з намі калядаваці…**

**План падрыхтоўкі гульнёва-забаўляльнай праграмы**
**“А ў нас сёння Каляда”**

| Змест | Адказныя |
|---|---|
| Падбор літаратуры, даведак для напісання сцэнара гульнёва-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда” | Педагогі дадатковай адукацыі |
| Знаёмства з каляндарна-абрадавай культурай зімовага цыкла; падбор відэа- і аўдыяматэрыялаў | Педагогі дадатковай адукацыі |
| сцэнаграфія і рэжысура гульнёва-забаўляльнай праграмы | Педагог-арганізатар, педагогі дадатковай адукацыі |
| Сустрэча са спецыялістамі Гоцкага сельскага Дома культуры па прываблiванні да ўдзелу ў гульнёва-забаўляльнай праграме | Педагог-арганізатар |
| Развучванне народных песень, танцаў, гульняў, карагодаў | Педагогі дадатковай адукацыі, класныя кіраўнікі |
| Афармленне школьнага памяшкання; стварэнне знешняга аблічча дзеючых асоб тэатралізаванага прадстаўлення | Педагогі дадатковай адукацыі, класныя кіраўнікі |
| Праца па ролях, прагонныя рэпетыцыі гульнёва-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда” | Педагог-арганізатар, педагогі дадатковай адукацыі |
| Запрашэнне журналістаў, гасцей | Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце |
| Папярэдняя сустрэча з носьбітамі мясцовага фальклору (запрашэнне да ўдзелу ў гульнёва-забаўляльнай праграме “А ў нас сёння Каляда” мясцовых гарманістаў, танцорак, спявачак; збор этнаграфічнага матэрыялу для афармлення сцэны і выставы; запіс народных песень, гульняў, карагодаў) | Педагог-арганізатар, педагогі дадатковай адукацыі |

**Мэта**: захаванне і развіццё беларускай народнай гульнятэкі.
**Задачы:**
- пазнаёміць навучэнцаў з асаблівасцямі святкавання Калядаў;
- далучыць дзяцей да трацыцый народнай культуры;
- стварыць атмасферу вясёлага народнага свята праз гульню;

- развіваць пазнавальную актыўнасць падлеткаў і моладзі, іх творчы патэнцыял, веру ў сябе і свае магчымасці;
- выхоўваць цікавасць да спадчыны свайго народа - традыцый, абрадаў, звычаяў.

**Мастацкі вобраз**:Дзед-Пачынальнік і Зорканоша.

**Метадычныя рэкамендацыі** па выкарыстанні варыятыўнасці ўдзелу ў гульнёва-забаўляльнай праграме “А ў нас сёння Каляда”:

1. гульнёва-забаўляльная праграма праводзіцца абавязкова з вялікім колам гледачоў;
2. у залежнасці ад мэты, пастаўленай арганізатарам, ад узросту і ўзроўню творчых здольнасцей дзяцей, гульнёва-забаўляльную праграму можна аздобіць выставай дэкаратыўна-прыкладной творчасці; дзіцячымі падзелкамі;
3. сцэнар гульнёва-забаўляльнай праграмы змяшчае мелодыі народных песень, беларускія гульні, побытавыя танцы, якія могуць быць выкананыя разам з мясцовымі спявачкамі, танцорамі і музыкамі.

**Працягласць:** 1 гадзіна

**Месца правядзення**: актавая зала ці пляцоўка

**Умовы**, неабходныя для рэалізацыі гульнёва-забаўляльнай праграмы:

-  удзел у праграме носьбітаў фальклору, мясцовых жыхароў, бацькоў і членаў аб’яднанняў па інтарэсах “Тэатральны калейдаскоп”, “До-рэ-мі”, “Юныя фалькларысты”;
-  выкарыстанне экспанатаў музея этнаграфіі і побыту в. Гоцк, этнамайстэрні для аздаблення інтэр’еру сцэны, дэкарацый і рэквізіту.

**Арганізатары тэатралізавана-гульнёвай праграмы:** кіраўнікі аб’яднанняў па інтарэсах, педагог-арганізатар

**Тэхнічнае абсталяванне:** баян, музычныя інструменты для “шумавога аркестра”: бубен, піла, качалка, лыжкі, верацяно, званочкі; музычны цэнтр, мікрафоны, фотакамера, гуказапіс народных песень

**Чакаемыя вынікі рэалізацыі** гульнёва-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда”:

- працягнуць працу ўстановы адукацыі ў распрацоўцы новых гульнёвых формаўтварэнняў, пабудаваных на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны;
- захаваць традыцыйныя гульнёвыя формы беларускіх народных святаў каляндарнага цыкла;
- павысіць пазнавальны накірунак у гульнёва-забаўляльных праграмах народнага свята;
- выкарыстоўваць у якасці носьбітаў сцэнарна-рэжысёрскага ходу праграм персанажаў адпаведных беларускіх абрадаў;
- адраджаць нацыянальную гульнёвую спадчыну, дапаўняць яе мясцовымі гульнямі і забавамі, ствараць на іх аснове новыя гульнёвыя дзеі;
- сфарміраваць актыўную творчую асобу, якая ўмее суперажываць, адчуваць, любіць і дзейнічаць.

## Сцэнарная распрацоўка гульнёва-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда”

**Для стварэння святочнай атмасферы гучыць фанаграма калядных песень. Адчыняецца заслона. На задніку – выява Каляднай зоркі. Гучаць пазыўныя святочна-забаўляльнай праграмы. На сцэне з’яўляюцца Дзед-Пачынальнік, Зорканоша, музыкі, пераапранутыя ў калядоўшчыкаў.**

Дзед-Пачынальнік.

Станавіцеся, людцы, у карагод,
Гэта свята мы чакалі цэлы год.
Трэба шчыра Каляду павітаці,
У яе гонар песню праспяваці!

**Удзельнікі святочна-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда” ствараюць карагод вакол ёлкі пад песню “Ой, калядныя, бліны ладныя” (дадатак 1).**

**З карагода выдзяляюцца дзве дзяўчыны-вядучыя. Усе астатнія сыходзяць са сцэны.**

Вядучая 1.

Добры вечар, шчодры вечар!
Добрым людзям на здароўе!

Вядучая 2.

У Калядны шчодры вечар
Усім вам шчасця і здароўя!

Вядучая 1.

Вітаем вас, шаноўныя, на нашым свяце!

Вядучая 2.

Шчыра запрашаем вас
З намі калядаваці!

Вядучая 1.

А каб калядаваць, трэба ж нешта пра Каляды знаць!

Вядучая 2.

Усім вядома, што Каляды святкуюць з 25 снежня па 7 студзеня. А адкажыце, даражэнькія, якая магічная страва гатуецца на Каляды?

(Адказ: “Куцця”)

Вядучая 2.

Так. Правільна, куцця. А можа адкажаце, якія тры куцці святкуюць на Беларусі?

(Адказ: перадкалядную посную, шчодрую або багатую пры сустрэчы Новага года 13 студзеня і галодную, вадзяную перад Вадохрышчам 18 студзеня)

Вядучая 2.

Правільна – посную, шчодрую і галодную. Пра Каляды вы амаль што ўсё ведаеце. Тады выходзьце да нас тыя, хто правільна адказаў. Будзем разам калядаваць.

**Удзельнікі выходзяць на плацоўку. У гэты момант гучыць вясёлая беларуская музыка.**

Вядучая 2.

Станавіцеся, калі ласка, паўколам.

Вядучая 1.

Як вядома, у час Каляд жанчыны звівалі клубкі нітак як мага лепей і больш, бо гэта спрыяла росту качаноў капусты. Абыякавае ж звіванне клубкоў знішчала ў валоў сілу ў нагах. Таму, даражэнькія мае, я прапаную вам на прыкладзе нашых бабуль звіць клубок. Каб не толькі капуста расла вялікая, але і каб гаспадарка была добрая.

**Дзяўчаты запрашаюць хлопцаў. Вядучыя выдаюць удзельнікам пражу з нітак.**

Вядучая 1.

Хлопцы, трымайце пражу, а дзяўчаты па маёй камандзе пачынайце віць клубкі. Раз, два, тры – пачалі!

**Ідзе конкурс-гульня. Па сканчэнні гульні вядучыя падводзяць вынікі.**

Вядучая 1.

Я бачу, вось гэтая пара звіла раней за усіх.

Вядучая 2.

Але вось у гэтай пары атрымалася лепей, значыць, капуста будзе вялікая. Хто ведае, можа яны там каго-небудзь знойдуць?

Вядучая 1.

А ў каго не атрымалася, не хвалюйцеся! Мы запрашаем да нас у госці козку шэрую. Бо якія ж Каляды без Казы? Яна заўсёды была сімвалам урадлівасці.

**Пачынаюць іграць музыкі, а Павадыр выводзіць у круг Казу, яна скача пад песню шчадроўнікаў.**

**Шчадроўнікі спяваюць:**

Мы самі ідзём
І Казу вядзём.
Гавары з намі –
З добрымі людзьмі.
Дзе Каза бывае,
Там шчасце чакае,
А дзе не бывае,
Там яно мінае.
Дзе Каза нагою,
Там жыта капою.
Дзе Каза рогам,
Там жыта стогам!
Ну-тка, Козанька,
Расхадзіся,
Па ўсяму двару
Разгуляйся!
- Го-го-го, Каза,



Го-го-го, шэра,
Дзе ты бывала?
- У шчырым бару
Ягадкі брала.
- Не йдзі, Козанька,
Ты ў тое сяло.
Бо ў тым сяле
Усе людзі стральцы.
Хочуць Казу ўбіць,
Шкуру аблупіць.

**Каза коле прысутных рагамі, а ў канцы песні падае пасярэдзіне і “памірае”, Павадыр спрабуе падняць яе: “Што ж гэта стала, мая Каза ўпала, ссохла, прапала”, а шчадроўнікі спяваюць:**



Ты,Каза-казішча,Устань,
развесяліся.
Ды расхадзіся:
Гаспадар ідзе,
Рэшата нясе.
Рэшата аўса,
Паверх каўбаса.
Тры кускі сала,
Каб каза ўстала.

**Усе Казу шкадуюць, спрабуюць падняць, а механоша прыгаворвае:**

Нашай Козаньцы нямнога трэба:
Два боханы хлеба,
Сем печ перапеч!
А яшчэ аладкі,
Каб бокі гладкі
Яшчэ таго мала:
Дайце кусок сала,
Чацвёрты пірог,
Каб Казу сцярог.
А хто харошы,
Хай насыпле грошы!



**Механоша збірае ахвяраванні і спявае:**

Шчодрыка збіраю,
Песеньку спяваю.
Я чалавек багаты:
У мяне ў адной кішэні вош на аркане,
А ў другой – блыха на цапе.

Шчодра дарыце, здаровы бывайце!

**Павадыр пачынае "лячыць" Казу:**

Не хоча Каза ўставаць,
Трэба лякарства ёй даць!
Нацерці бок кійком, падняць багатом.
Каза мая вучная,
Кіем хрышчоная.
Прайшла ўсе навукі,
Ведае розныя штукі.
А ну закладай рогі ды падбірай ногі,
З хаты выхадзі, бяду вынасі!
Уцякай хутчэй з гаспадарскіх вачэй!
А ў гэтым доме не шкодзіць нікому!

**Каза ўсхопліваецца, а шчадроўнікі спяваюць:**

- Не баюся я тых стральцоў-байцоў,
Толькі баюся старога дзеда.
Стары той дзеда не падарак,
Ён жа мяне кіем ударыць.
У правае вушка – пацячэ юшка,
У правы бачок – пацячэ сачок.

**Павадыр прыгаворвае:**

- Ой ты, Казішча, старая псішча,
Паньству пакланіся.
Хай жывуць здаровы
З дзеткамі-галубкамі,
З далёкімі сябрамі,
З блізкімі суседзямі ў карысці,
У радасці, у добрым здароўечку!



Вядучая 2.

Кажуць, хто з Казою патанцуе, таму ў гэтым годзе пашанцуе. Станавіцеся вакол Казы ў карагод – каб дзетак у вас нарадзілася за год!

**Гучыць музыка, усе ўдзельнікі становяцца ў карагод.**

Вядучая 1.

Каза будзе вам рухі паказваць, а вы за ёю паўтарайце, пры гэтым ідучы па крузе. Калі Каза каго-небудзь заказыча, той становіцца замест яе ў круг і паказвае ўжо свае рухі.

**Ідзе гульня-танец (дадатак 2)**

Вядучая 1.

Малайчына, Козачка! Добра паскакала і людзей павесяліла, а зараз ідзі па іншых хатах калядаваць.

Вядучая 2.

А, госцікі, якія малайцы, так добра танчылі, нібы ўсё жыццё ў балетнай школе правучыліся. Але ж мне цікава, ці спрытныя вы да гульняў?

**Удзельнікі адказваюць.**

Вядучая 2.

Калі так, я прапаную гульню. Вось дзяўчына – нібы вішанька, такая ж прыгожая, спраўная. Я прапаную выйсці на пляцоўку прыгожаму хлопцу, які пасадзіць дзяўчыну-вішаньку сабе на плечы. Я даю вішаньцы саломінку, якую яна ўвесь час трымае ў вуснах, паварочваючы галаву то ў адзін, то ў другі бок. Вось такім чынам (паказвае). А ўсе астатнія будуць вадзіць вакол яе карагод. Як толькі музыка сціхне, хлопцы, якія бліжэй за астатніх стаяць каля "вішанькі" з абодвух бакоў, павінны будуць падскочыць так, каб ухапіць саломінку сваімі вуснамі. Хто першы схопіць, той у якасці падарунка атрымае пацалунак ад прыгажуні.

**Ідзе гульня "Вішанька".**

Вядучая 1.

А падарунак – салодкі пацалунак ад нашай прыгажуні!

Дзяўчына і хлопец цалуюцца тры разы.

Вядучая 2.

Ну вось і пацалаваліся. Але гэта яшчэ не ўсё. Зараз я прапаную ўсім астатнім такую цудоўную гульню "Падушачка". Хто не атрымаў пацалункаў, неўзабаве хутка атрымае. Станьце, калі ласка, у кола. Зараз мы з вамі пойдзем па ходу сонца, а выбраны па лічылцы хлопец – супраць яго з падушачкай. Як толькі скончацца словы песні:

Падушачка, падушачка, мая пухавая.

Малодачка, малодачка, мая маладая.

Вядучая 2.

Каго люблю, каго люблю, таго пацалую.

Падушачку, падушачку маю падарую.

Насупраць каго спыніцца хлопец, той з ім павінен будзе пацалавацца ў коле, стоячы на падушачцы на каленях. Пасля той, з кім пацалуецца хлопец, такім жа чынам павінен выбраць сабе пару, і гэтак далей. Зразумела? Пачынаем!

**Выконваецца гульня-карагод "Падушачка".**

Вядучая 1.

Пацалункі сягоння атрымалі, стравы калядныя назвалі…

Вядучая 2.

Але такую страву, як "пячоны кот", ніхто не назваў. Можа, вы не ведаеце такой стравы? (Гледачы адказваюць).

Вядучая 1.

Калі не ведаеце, дык зараз даведаецеся. Станавіцеся ў дыяганаль усе.

У гэты час хлопец выносіць на шасце пячонага ката, у якога замест хваста – кавалачак каўбасы.

Вядучая 2.

Зараз пад словы:

Еду з кута па ката –

Цап-лап за ката!

Вы павінны да яго падбегчы і паспрабаваць адкусіць кавалачак хваста. Той, у каго гэта атрымаецца, атрымае ў падарунак увесь каўбасны хвосцік. Зразумела? Пачалі!

**Гучыць музыка.**

Вядучая 1.

Малайцы! Ну дык няхай так, няхай сяк – няхай будзе “Кракавяк!” А каб добра было скакаць, трэба ўсе рухі за мной паўтараць.

**Гучыць “Кракавяк”**

Вядучая 2.

А ці ведаеце вы, што напярэдадні Новага года існуе звычай красці. Таму кожнага, хто прыходзіў у хату вечарам, прымалі за злодзея! Хавалі рэчы. Крадуць нават скаціну. Але на другі дзень прыносяць і прыводзяць да гаспадара ўкрадзенае, і той павінен іх частаваць. Вось так, мае даражэнькія! Не стаміліся? Хочаце яшчэ пагуляць? Калі хочаце, давайце пагуляем. Гульня называецца “Шкута” Станавіцеся, калі ласка, у паўкола. Вось бачыце, у мяне ў руках пятак, ды не медны, а залаты. Зараз я пайду паўз паўкола, ды залаты каму-небудзь з вас аддам. Трэба выбраць таго, хто знойдзе гэты залаты (па лічылцы ідзе выбар).

Слухайце далей. Той, каго выбралі, павінен знайсці залаты, калі знойдзе, то забірае грошы і становіцца на маё месца, а той, у каго пятак быў, пільнуе.

У ходзе гульні гульцы кажуць словы:

Шкута ідзе, золата нясе.
А хто адгадае,
Той вялікае шчасце мае.

**Пад музыку ідзе гульня “Шкута”**

Вядучая 1.

Шаноўныя, а ці ведаеце вы, што ўсе ігрышчы па традыцыі заканчваліся вясёлымі скокамі і танцамі. Дык давайце і мы, людцы даражэнькія, будзем захоўваць традыцыі нашых продкаў і скончым гульнёва-забаўляльную праграму “А ў нас сягоння Каляда” танцамі. Калі ласка, Музыка, зайграй нам “Полечку”.



**Гучыць “Полечка”, усе ўдзельні танчаць**

Дзед – Пачынальнік (пасля танца)

Каб прынёс год Новы вам
Дабрабыт і плён.
Многа радасці, веру светлых дзён!
Няхай збудзецца,
Што жадаецца.
Што задумана – прыдбаецца.
Усяго вам добрага!

Вядучая 1.

І шкада, а ўсё ж бывайце!
Толькі нас не забывайце!
Дружна жывіце!
Хутка расціце!

Край свой любіце!
Не таму любіце, што за ўсе цяплейшы ці прыгажэйшы,
А таму любіце, што за ўсе мілейшы,
За ўсе даражэйшы.
Каза.
Трэба нам ужо ў дарогу
Ды да іншага парогу,
Добрых людцаў віншаваць
Ды са святам прывітаць!..
Разам.
Дзякуем за ўвагу, юнакі і дзяўчаты, і ўсе дзеці!
Дай Бог вам шчасця ў свеце!
**Выходзяць з песняй "Ішла Каляда, калядуючы" (дадатак 3)**






**Вынікова-рэфлексійны этап гульнёва-забаўляльнай праграмы “А ў нас сёння Каляда”**

| № п/п | Змест | Адказныя |
|---|---|---|
| 1. | Калектыўнае абмеркаванне. Пасяджэнне аб’яднанняў па інтарэсах “До-рэ-мі”, “Юныя фалькларысты”, “Тэатральны калейдаскоп”, “Творчая майстэрня”, “Сталярны майстар” у форме круглага стала “А ў нас усё атрымалася!” | Педагогі дадатковай адукацыі |
| 2. | Стварэнне відэатэкі, фанатэкі “Беларускія народныя гульні” | Педагог-арганізатар |
| 3. | Сістэматызацыя напрацаванага матэрыялу “Метадычная скарбонка” | Педагогі дадатковай адукацыі |
| 4. | Анкетаванне ўдзельнікаў гульнёва-забаўляльнай праграмы | Педагог-арганізатар |
| 5. | Распаўсюджванне вопыту. Выступленне ў Гоцкім сельскім Доме культуры | Педагогі дадатковай адукацыі<br>Педагог-арганізатар |
| 6. | Арганізацыя святкавання Калядаў у сем'ях | Нам. дырэктара па ВР |

# Заключэнне

Беларускія гульні, карагоды, песні, танцы фарміруюць у вучняў любоў да роднага краю. Дзеці не павінны цурацца сваіх каранёў, павінны ганарыцца тым, што нарадзіліся і жывуць у цудоўным краі. Мы, педагогі, стараемся захаваць у сэрцах выхаванцаў любоў і павагу да тых каштоўнасцей, таго спрадвечнага ладу жыцця, якога прытрымліваліся нашыя продкі на працягу многіх стагоддзяў.

Сёння неабходна клапаціцца аб тым, каб захаваць сябе і не знікнуць з твару зямлі, перадаць спадчыну дзецям.

Хочацца верыць, што, развіваючы творчыя здольнасці вучняў праз беларускую народную гульню і карагод, беларускую песню і танец, мы сфарміруем асобу, здольную стаць актыўным носьбітам нацыянальнай культуры, выхаваем сапраўднага грамадзяніна-патрыёта.

Мой род, мой радавод, мой лёс
У памяці маёй павінен быць,
Каб пылам бездухоўным не занёс
Яго наступны век, у якім нам жыць…

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Аляхновіч, А. М. Беларускі дзіцячы фальклор /А. В. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў. — Мінск: Беларусь, 1993. — 270 с.

2.Вольскі, А. В. Заранка: кн. для дадатковага чытання ў 1 –м кл./А. В. Вольскі. —Мінск; Нар. асвета, 1988. - 168 с.

3.Марціновіч, Л. С. Сцяжынка / Л. С. Марціновіч, Т. У. Юрэвіч. — Мінск: Нар. асвета, 1994. — 319 с.

4. Сахута, Я.М. Фарбы роднай зямлі: Нарысы пра народнае мастацтва Беларусі: Кніга для вучняў / Я.М. Сахута – Мінск: Народная асвета, 1985. – 191 с.

**Дадатак 1**

## Ой, калядныя бліны ладныя…
## песня

Ой, калядныя, бліны ладныя,
Ой, лялю рана, бліны ладныя.
Ой, пшанічныя, дзеўкі пышныя,
Ой, лялю рана, дзеўкі пышныя.
Ой, аржаныя, хлопцы дурныя.
Ой, лялю рана, хлопцы дурныя.
Ой, павыбілі дзеўкі сцежачкі.
Ой, лялю рана, дзеўкі сцежачкі.
Яны, ходзячы ў начлежачкі,
Ды муку-крупу яны носячы.
Ой, лялю рана, яны носячы,
Музыканціка яны просячы,
Ой, лялю рана, яны просячы.

**Дадатак 2**

## Козанька
## гульня-карагод

Пакажы, козанька,
Павітай, козанька,
Як бабушкі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак,
Так бабушкі скачуць.

Пакажы, козанька,
Павітай, козанька,
Як мужчынкі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак,
Так мужчынкі скачуць.

Пакажы, козанька,
Павітай, козанька,

Як дзевачкі скачуць?
Вось і так,
Так і гэтак,
Так дзевачкі скачуць.

Пакажы, козанька,
Павітай, козанька,
Як хлопчыкі скачуць?
Вось так,
Так і гэтак,
Так хлопчыкі скачуць.

Пакажы, козанька,
Павітай, козанька,
Як казёл скачыць?
Вось так,
Так і гэтак,
Так казёл скачыць.

**Дадатак 3**

**Ішла Каляда**
**песня-карагод**

Ішла Каляда, калядуючы.
Шчодры вячор, багаты вячор!*
За ёй дзеўкі, шчадруючы.
-Ці дома, дома сам пан гаспадар?
Калі ты дома, накрывай на стол.

*Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка

.